# Пераможцы літаратурнага конкурсу «Дэбют-2024»

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў літаратурнага конкурсу «Дэбют-2024», арганізаванага Першамайскім раёнам сталіцы. Гэта літаратурная падзея адбылася ў 25-ы раз.**



Творы былі размеркаваны па трох тэмах: «Беларусь – краіна са Знакам якасці», «Вайны свяшчэнныя старонкі навекі ў памяці людской», «Паміж мінулым і будучыняй: партрэт майго пакалення».

Конкурс накіраваны на выхаванне пачуцця патрыятызму ў сучаснікаў, пачуцця любові да Радзімы, да малой радзімы, да яе гістарычнай спадчыны. Адна з задач літаратурнага спаборніцтва – гэта зварот увагі грамадства на неабходнасць выхавання асноўных маральных якасцей і агульначалавечых каштоўнасцей. У час падрыхтоўкі работ на конкурс выкладчыкі звярнулі ўвагу на развіццё цікавасці і любові да роднай мовы, да літаратурнай спадчыны беларускага народа.

Ацэньвала творы аўтарытэтнае журы, у склад якога ўвайшлі вядомыя беларускія літаратары: Віктар Праўдзін, Навум Гальпяровіч, Дзмітрый Карань – старшыня Мінскага гарадскога аддзялення «Беларускі фонд міру», прадстаўнікі дзіцячага часопіса «Качели», газеты «Шапокляк», агенцтва «Мінск-Навіны». На конкурс літаратурныя работы былі прадстаўлены на дзвюх мовах: рускай і беларускай. Упершыню ўдзел прымалі замежныя студэнты, якія навучаюцца ў БДАТУ.

Студэнты факультэта прадпрымальніцтва і кіравання пад кіраўніцтвам старшых выкладчыкаў кафедры практычнай лінгвістыкі Віткоўскай А.І. і Смалянка Г.А. прынялі актыўны ўдзел у розных намінацыях.

Дыпломамі 1 ступені ўзнагароджаны студэнты Шаўлоўская Ксенія і Гарбатоўская Лізавета.

Дыпломы 2 ступені атрымалі Рублеўская Лізавета і Чарыева Гунча (Туркменістан).

Падзяка Беларускага фонда міру – ў Жаркова Уладзіслава (Расія).

За 25 гадоў конкурс стаў прыкметнай з'явай ў творчым жыцці Першамайскага раёна. Студэнты яго чакаюць, да яго старанна рыхтуюцца. За гэты перыяд ён выявіў і падтрымаў многія сотні талентаў, пры гэтым штогод развіваецца, прываблівае ўсё новых удзельнікаў. Гэты конкурс – сапраўднае выяўленне творчага патэнцыялу, літаратурна-мастацкіх здольнасцей нашай моладзі.

**А.І. ВІТКОЎСКАЯ,**
**Г.А. СМАЛЯНКА,**
**ст. выкладчыкі**
**кафедры практычнай лінгвістыкі**